ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 176 (1143) | СУБОТА, 2-га жніўня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Усебеларуская нарада па транспарту

4-га жніўня пры ЦК ЛКСМБ склікаецца Усебеларуская нарада па транспарту з наступнай абвесткай дню.

1. Папярэднія вынікі падрыхтоўчай кампаніі да перавыбараў фабзавмясцкомаў і далейшыя задачы.

2. Аб ходзе падрыхтоўкі да асеньня-зімніх перавозак.

На нараду прадстаўлены месцы наступным акругам: Віцебску—3, Гомелю—3, Оршы,—3, Полацку—2, і Жлобінскаму р-ну 3.

З Менску павінны прысутнічаць усе сэкратары цэхавых ячэяк МББ чыгункі.

УЗМАЦНІЦЬ ДБАЙНАСЬЦЬ НА ВАЖНЕЙШЫМ ВУЧАСТКУ ФРОНТУ

Два гады назад VI конгрэс Комінтэрну, у парадку дня якога стаяла пытаньне аб вайсковай небясьпецы, вынес пастанову аб штогодняй першажнівеньскай дэмонстрацыі супроць вайны.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, выканаўшыя гэтую пастанову масы вышлі на вуліцу, наглядна паказваючы буржуазіі баявую гатоўнасьць рабочае клясыператварыць падрыхтоўваемую буржуазіяй імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую.

Мінулы год быў годам асаблівага абвастраньня стабілізацыі капіталізму, годам разгортваючагася ў сусьветным маштабе эканамічнага крызісу, годам далейшага ўзмацненьня вайсковай небясьпекі.

Што адбылося пасьля 1-га жніўня мінулага году, калі мы мелі першую адначасовую міжнародную дэмонстрацыю супроць вайны?

Шалёным тэмпам працягваюцца ўзбраеньні на сухазем'і, на моры і ў паветры. Пацярпела поўны крах Лёнданская конфэрэнцыя па скарачэньню морскіх узбраеньняў (аб скарачэньні ўзбраеньняў на сухазем'і нікто нават ня ўзьнімае гутарак усур'ёз).

На фоне разгортваючагася сусьветнага эканамічнага крызісу рэзка ўзрастае агрэсыўнасьць амэрыканскага імпэрыялізму, узмацняецца выцясьненьне Ангельшчыны з рынкаў, якімі яна да гэтага часу ўладала.

Аб насьпяваючай вайне паміж Англіяй і Амэрыкай гаворыцца зусім адкрыта. Вялізарны крок наперад зрабіла падрыхтоўка Франка-Італьлянскай вайны. Францыя занялася сплашным умацаваньнем сваіх італьлянскіх межаў. Францыя адкрыта ўзбройвае Юга-Славію супроць свайго ўчарайшага італьлянскага саюзьніка.

Значна ўзрасьлі рэваншскія настроі Нямеччыны ў бок Францыі і Польшчы. Адчайнае і ўсё горшае гаспадарчае становішча Нямеччыны непасрэдна зьвязана з выкананьнем пляну Юнга. Супярэчнасьці паміж краінамі перамогшым і пацярпеўшымі паражэньне ў сусьветнай вайне не вырашаюцца, як сьцьвярджаюць соцыял-фашысты і правыя опортуністыя. Яны абвастраюцца з прычыны свайго сапраўднага вырашэньня ў агні новых войн і рэволюцый.

Аднак, галоўнай знадворнай супярэчнасьцю сучаснага пэрыоду зьяўляецца супярэчнасьць паміж капіталістычным сьветам у цэлым і Савецкім Саюзам.

Буржуазія цэлага шэрагу краін рыхтуе ў першую чаргу вайну супроць СССР. Анты-савецкая кампанія капіталістычных краін з 1918 году не дасягала яшчэ такіх памераў і сілы, як у сучасны момант.

Фашысцкі пераварот у Фінляндыі, выкарыстаньне Х-гадовага юбілею Савецка-польскай вайны для інсцэніроўкі самай наглай анты-савецкай кампаніі для новага паходу на Кіеў, шалёная дыплёматычная актыўнасьць польскага фашызму ў Эстоніі, Латвіі, а за апошні час таксама ў Літве, паўнейшая фашызацыя дзяржаўнага ладу ў Румыніі, зьвязаная з прыходам да ўлады новага караля,—вось факты сёньнешняга дня, якія сьведчаць аб адкрытым узмацненьні тэмпаў падрыхтоўкі наступальнай анты-савецкай вайны.

Калі буржуазія не пачне гэтай вайны сёньня, дык толькі таму, што яна баіцца рэволюцыйных мас у сваім уласным тыле і рас учай магутнасьці СССР.

Вось чаму бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі Савецкага Саюзу, якая ўзмацняе яго эканамічную і вайсковую магутнасьць, зьяўляюцца самай моцнай гарантыяй міру, якая толькі можа існаваць для савецкай краіны, што знаходзіцца ў капіталістычным абкружэньні.

Вось чаму правыя опортуністыя ў СССР, якія змагаюцца супроць бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі, ператвараюцца фактычна ў такіх-жа ворагаў рабочае клясы і соцыялізму, як і правыя опортуністыя капіталістычных краін, якія імкнуцца (разам з троцкісцкімі рэнэгатамі) зрываць рэволюцыйную мобілізацыю мас супроць вайны і ў абарону Савецкага Саюзу.

І вось чаму правым опортуністым, агентам клясавага ворага, няма месца ў шэрагах Комінтэрну і ў шэрагах яго буйнейшай сэкцыі—УсеКП(б).

Компартыі капіталістычных і колёніяльных краін адкажуць на ўзмацненьне вайсковай небясьпекі якое суправаджае растучы крызіс, на пагоршаньне становішча рабочых мас, капіталістычную рацыяналізацыю, далейшае наступленьне капіталу на жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы,—узмацненьнем сваёй барацьбы супроць вайны.

Нашы партыі яшчэ не пасьпелі аўладаць растучай рэволюцыйнай актыўнасьцю мас, яшчэ не навучыліся організацыйна замацоўваць свой растучы ідэёвы ўплыў. Гэта адчуваецца і на фронце анты-ваеннай барацьбы ў цэлым. У шэрагах компартый яшчэ існуе опортуністычная недаацэнка ваеннай небясьпекі. Права-опортуністычная недаацэнка ваеннай небясьпекі (якая зараз зьяўляецца характэрнай рысай рэнэгатаў комунізму ад Брандлера да Троцкага) органічна зьвязана з усёй сыстэмай поглядаў правага опортунізму.

Барацьба з правым опортунізмам і фактычна дапамагаючым яму „левым" сэктанствам, ёсьць ня толькі магутны сродак у мацненьня комуністычных партый і сувязі з масамі. Яна зьяўляецца магутнай зброяй барацьбы супроць вайны.

Сёньня рабочыя і працоўныя масы СССР, капіталістычных і каленіяльных краін прадэмонструюць свае сілы супроць падпальшчыкаў новай вайны, за мірную палітыку Савецкага Саюзу, за міжнародную Пролетарскую Рэволюцыю, якая пакладзе канец усякім войнам.

(„ПРАВДА")

Ліст з Нямеччыны

Моладзь пераможа

1-ае жніўня 1914 году назаўсёды засталося ў мазгу мільёнаў рабочых таксама як і ўспаміны аб міжнароднай бойні, якая цягнулася 4 гады, з усімі яе жахамі і зьверствамі. Дзень 1-га жніўня стаў традыцыйным баявым днём протэсту рэволюцыйнага пролетарыяту супроць імпэрыялістычнай вайны. На гэты раз ён больш чым за ўсе папярэднія гады праходзіць пад сьцягам мобілізацыі ўсіх эксплёатуемых і прыгнечаных усіх рабочых, сялян і колёніяльных нявольнікаў супроць новых ваенных пляноў імпэрыялізму.

Абавязковай складанай часткай інтэнсыўнага ваенных падрыхтаваньняў буржуазіі зьяўляецца яе політыка ў адносінах да моладзі. У адной толькі Нямеччыне з мільёнаў моладзі звыш паловы сконцэнтравана ў „рэспубліканскіх", каталіцкіх і фашысцкіх організацыях, у так званых „нэйтральных" спортыўных організацыях і г. д.

Побач з гэтай гіганцкай рэзэрвнай арміяй буржуазіі, маецца, акрамя КСМ Саюз Маладых Чырвоных Франтавікоў,—баявая організацыя працоўнай моладзі, мэта якое—перашкаджаць ваенным плянам буржуазіі, вырваць рабочую моладзь з кіпцюроў клясавага ворага і прыцягнуць яе на бок Чырвонага Клясавага Фронту. Па гэтых меркаваньнях Саюз Маладых Чырвоных франтавікоў ужо ў 1928 г. упярвшыню прав ў антымілітарыстычны тыдзень моладзі, які з таго часу ўвайшоў у традыцыі рэволюцыйнай пролетарскай моладзі.

Антысавецкае цкаваньне рэволюцыйных організацый, якое суправаджалася белым тэрорам і масавым забойствам рэволюцыйных рабочых, кленны покліч 2-га Інтэрнацыяналу супроць СССР—усё гэта знаходзіць свой адбітак у організацыі моладзі нашых клясавых ворагаў. Так, напрыклад, агульнанямецкая сэкцыя моладзі Саюзу Рэспубліканскага Сьцягу сабралася пад лёзунгам барацьбы супроць бальшавізму. Старшыня Саюзу Рэспубліканскага Сьцягу соцыял-дэмократ Гервінг, зусім адкрыта агалосіў неабходнасьць ніэрынуцьця і зьнішчэньня бальшавізму мэтах ратаваньня капіталізму.

Гэта, пабіваючае ўсе рэкорды цкаваньне з боку варожых організацый моладзі, зьяўляецца акомпанімэнтам да эканамічнага і політычнага генэральнага наступленьня капіталізму супроць працоўнай моладзі. Як у Сярэдняй Нямеччыне, так і ў Рурскай вобласьці і ва ўсіх іншых прамысловых цэнтрах, наступленьне сплачонага фронту прадпрыемцаў у першую чаргу накіравана на павялічэньне рабочага дня і зьніжэньне зарплаты моладзі.

Побач з гэтым эканамічным націскам, варожыя організацыі моладзі, пачынаючы ад саюзу соцыялістычнай рабочай моладзі, аж да саюзу нацыянал-соцыялістычнай фашысцкай моладзі, вядуць самую жорсткую барацьбу супроць рэволюцыйнай рабочай моладзі з мэтай зьнішчыць яе організацыі і палкам прыцягнуць працоўную моладзь у свае організацыі, сформаваныя і кіруемыя па ваеннаму ўзору поліцыяй, былымі афіцэрамі і рэйхсвэрам.

Цэнтральнае месца ў нашай барацьбе супроць пагрозы імпэрыялістычнай вайны займае ў час анты-мілітарыстычнага тыдню молад і барацьба супроць забароны Саюзу Чырвоных франтавікоў і Саюзу маладых Чырвоных франтавікоў. Забарона не змагла суняць нястрымнага наступленьня.

Маладыя Чырвоныя Франтавікі ня толькі існуюць, але фронт іх усё пашыраецца. Да яго далучаюцца ўсё новыя і новыя маладыя рабочыя, якія пакідаюць Саюз Рэспубліканскага Сьцягу, Саюз Соцыялістычнай Рабочай Моладзі, фашысцкія організацыі моладзі і г. д. У Мансфэльдзе і ў Рурскай вобласьці рабочая моладзь стаіць у першых шэрагах барацьбы супроць прадпрыемцаў фашызму і соцыял-фашызму.

У шэрагах працаўнікоў усё больш і больш узрастае нездавальненьне працоўнай моладзі. Амаль ва ўсіх частках Нямеччыны організацыі моладзі пры Саюзе Рэспубліканскага Сьцягу паўстаюць супроць праводзімага Гервінгам ваеннага курсу, салідарызуюцца з Саюзам Маладых Чырвоных Франтавікоў і вядуць сумесна з ім барацьбу супроць фашысцкага тэрору.

Антымілітарыстычны тыдзень моладзі праходзіць пад сьцягам усё ўзрастаючай баявой рашучасьці пролетарыяту і ўсё ўзмацняючагася разлажэньня варожых організацый.

Ваенным падрыхтаваньням буржуазіі рабочая моладзь супроцьстаўляе сваю рэволюцыйную політыку. Выступленьне Саюзу Маладых Чырвоных Франтавікоў у красавіку было вялікім крокам наперад. У час антымілітарыстычнага тыдню моладзі мы з падвоенай энэргіяй па ядзем барацьбу супроць нашых клясавых ворагаў і іх прыслугачоў каб вырваць з іх кіпцюроў усіх маладых рабочых.

Пераможа той, на чыім баку моладзь!

Кіраўнік Бэрлінскай організацыі Маладых Чырвоных Франтавікоў
КАРЛ РОТЭР

У краіне організаванага поліцэйскага тэрору



4-га ліпеня адбылося пахаваньне забітага нью-ёрскай поліцыяй мэксіканскага комуністага Гонзалеса.

Пахаваньне тав. Гонзалеса ператварылася ў грандыёзную дэмонстрацыю, у якой прымала ўдзел звыш 25 тысяч чалавек.

На здымку: Амэрыканскія піонэры праваджаюць забітага тав. Гонзалеса.

Чырвоныя сьцягі рэюць над Чанша

Часьці Чырвонай арміі бяз бою аўладалі горадам

З Ханькоу высланы буйныя вайсковыя сілы, браніраваныя цягнікі, аэропляны і ваенныя судны з загадам любою цаной заняць Чанша

ШАНХАЙ, 31. Непасрэдных вестак з Чанша пакуль ня маецца. Большасьць паведамленьняў, якія паступаюць з Ханькоу ад тэлеграфных агенстваў Рэйтэр і Сімбун-Рэн о яўна тэндэнцыёзна і неправападобна.

Аднак на падставе гэтых вестак некалькі высьвятляецца агульны стан. Барацьба за Чанша пачалася 26-га ліпеня, калі пераадзетыя ў вольнае адзеньне чырвонаармейцы і комуністы ў вялікай колькасьці ўвайшлі ў горад. 27-га ліпеня чырвоныя войскі, падышоўшы да гарадзкіх сьцен, безадкладна ўступілі ў Чанша.

Паніка, якая ахапіла горад, яшчэ больш узмацнілася ў сувязі з паўстаньнем часьцей мясцовага гарнізону, відочна перайшоўшых на бок чырвоных. Губэрнатар Чанша відныя чыноўнікі і большасьць урадавых войск уцяклі яшчэ 26-га ліпеня. Войскі, якія імкнуліся абараняць горад, панесьлі буйныя страты.

Часьці Чырвонай арміі ўвайшлі ў Чанша з чырвонымі сьцягамі з чырвонымі лентамі і краскамі у пятліцах. Па паведамленьнях паказаных тэлеграфных агенстваў горад быў зараз-жа ўпрыгожаны чырвонымі сьцягамі, зьявіліся комуністычныя лістоўкі і лёзунгі.

Імпэрыялістычны друк у Кітаі ўзмоцнена распускае самыя нікчэмныя і агідныя чуткі, аб дзейнасьці часьцей Чырвонай арміі, якія занялі Чанша.

Увесь гэты шум, узьняты імпэрыялістычным друкам бясспрэчна мае сваей мэтай падрыхтоўку грамадзкай думкі ў Кітаі і заграніцай да выступленьня марскіх сіл імпэрыялістых, якія сконцэнтравалі свае сілы на рацэ Сян-цзян каля Чанша.

З Ханькоў і Чанша высланы буйныя ваенныя сілы, браніраваныя цягнікі, аэропляны і ваенныя судны, з загадам любою цаною заняць Чанша. Пакуль яшчэ няма вестак аб сутычцы гэтых сіл з Чырвонай арміяй.

Адкрыўся 3-ці тыраж III-й пазыкі індустрыялізацыі

Учора ўвечары ў Менску ў памяшканьні клюбу харчавікоў адкрыўся 3-ці тыраж III-й пазыкі індустрыялізацыі. У тыражнай камісіі прымаюць удзел прадстаўнікі фабрык, заводаў, саўгасаў, колгасаў і Чырвонай арміі.

Памяшканьне клюбу перапоўнена працоўнымі гор. Менску. Уступную прамову аб значэньні пазыкі і 3-га тыражу зрабіў Народны Камісар Фінансаў БССР і намесьнік старшыні тыражнай камісіі тав. Мікуліч.

З прывітаньнямі выступілі: прадстаўнікі ўраду, фабрык і заводаў колгасаў і Чырвонай арміі.

Пад гучнымі воплескамі былі прыняты і пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б і ЦВК і СНК СССР і БССР.

Пасьля прывітаньняў пачаліся розыгрышы процантных абліґацый III-й пазыкі індустрыялізацыі.

Рашэньні партзьездаў—у масы колгасьнікаў

(Па тэлефону ад нашага корэспондэнта).

27-га ліпеня ў м. Плешчаніцы адбыўся раённы зьлёт калгасьнікаў, прысьвечаны вынікам XVI і XIII парт. зьездаў, на якім прысутнічала 600 чал. колгасьнікаў. З дакладам выступіў удзельнік зьезду. На зьлёце былі заслуханы рапарты буйных калгасаў раёну.

На праводзімым зьлёце колгасьнікаў прысутнічала 25 рабочых транспартнікаў, якія шэфствуюць над раёнам.

Зьлёт паслаў прывітаньне Заходняй Беларусі.

Зьлёту ад імя шэфаў быў прыпаднесен ЧЫРВОНЫ ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ДЛЯ ЛЕПШАГА КОЛГАСУ РАЁНУ.

ГЕЛЬФМАН.

Сілос усё-ж яшчэ ня ў ямах

Комсамолія, даволі таптацца на месцы! За намі неаплочаны рахунак—сотні і тысячы нявыкапаных ям і траншэй і дзесяткі тысяч незасілосаваных тон

Жывёла чакае ад нас не абежнікаў па сілосаваньню, а сілосаваны корм

З усёй бальшавіцкай упартасьцю атакаваць тых, якія зрываюць справу сілосаваньня

Сілосныя ямы павінны быць выкапаны і засілосаваны

Трохмесячная мітусьніна, ўзгадненьні, урэзкі плянаў, дзесяткі і сотні паседжаньняў па пытаньню сілосаваньня ніякіх вынікаў па БССР не далі.

Наша газэта, пачынаючы з мая месяца, увесь час сыгналізавала аб тых прарывах, якія (на вялікі жаль) мелі і маюць месца ў справе сілоснага будаўніцтва і сілосаваньня кармоў. Здавалася-б, што сёньня трэба было-б паказваць добрыя вузоры практычнай работы комсамольскіх ячэек, паасобных раёнаў і акруг у барацьбе за сілос. Але, на вялікі жаль, мы маем адзінкі ячэек, якія па-бальшавіцку на практыцы выканалі свой абавязак перад партыяй. **Раёнаў і акруг, якія-б маглі заявіць аб тым, што плян па сілоснаму будаўніцтву выканан хоць-бы на 25-30 проц., у БССР няма.**

Раённыя і акруговыя камітэты абмежаваліся толькі цыркулярамі і больш нічога не зрабілі ў справе сілосаваньня.

Сёньня роўна 8 дзён з таго часу, як пачаўся сілосны тыднёвік, але ён патрэбнага зруху ня даў.

Ня гледзячы на сыгналы друку і ў прыватнасьці „Чырвонай Зьмены", бязьдзейнасьць у р-х і акругах працягваецца.

Зьмяшчаемы ў сёньнешнім нумары матар'ял аб Заслаўскім, Рэчыцкім, Дрысенскім і Сьмілавіцкім раёнах з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што раённыя камітэты комсамолу па наплявацельску адносяцца да крытыкі і сыгналаў друку, бязьдзейнічаюць, не выпраўляюць прарываў сілоснага фронту.

Гэты матар'ял падкрэсьлівае, што кіраўніцтва організацый гэтых раёнаў ня здольны па-ударнаму змагацца за заданьні партыі.

Даволі хавацца за сілоснымі цыркулярамі. Час па-ударнаму ўзяцца за капаньне сілосных ям і траншэй. Жывёла чакае ад нас смачнага сілосаванага корму. Неаплочаны рахунак—выкапаць 1.000.000 сілосных ям і траншэй—павінен быць аплочан.

Сілосныя ямы і траншэі павінны быць выкапаны і засілосаваны.

Сілосаваньне пад зрывам

Газэта „Чырвоная Зьмена" ў 126 нумары сыгналізавала аб тым, што праца па сілосаваньню ў Сьмілаўскім раёне праходзіць дрэнна. Але трэба сказаць, што сыгналы „Чырвонай Зьмены" **ні ячэйкі, ні РК не пачулі.** *Спачатку праца па сілосаваньню як-бы пачалі разгортвацца, наладжваліся сходы, нарады і г. д. Але як прышлі да практычнай працы,* **дык тут і заснулі.** *РК комсамолу на пленуме прыняў пастанову, каб кожная ячэйка выкапала ня менш, як 5 сілосных ям. Але, на вялікі жаль, гэтая максымальная лічба ячэйкамі ня выконваецца. Брыгады, якія былі мобілізаваны райкомам для пасылкі ў вёскі, на месцы ня выехалі. Райком сьпіць, сьпяць і ячэйкі, а сілосаваньне пад зрывам.*

М. Я. Боська.

У Заслаўскім р-не яшчэ скарочваюць заданьні па сілосу

300 ям скарацілі да 70

На старонках „Чырвонай Зьмены" ня раз пісалася аб тым, што справа сілосаваньня ў Заслаўскім раёне пастаўлена вельмі дрэнна. Гэтае становішча працягваецца і па сёньня.

Толькі ў 7 колгасах пачалося будаўніцтва сілосных ям, а ў астатніх 11-ці колгасах яшчэ і ня думаюць брацца за гэтую работу. Індывідуальным сэктары таксама нічога ня робіцца. Сельсаветы сілоснай справай не займаюцца. Старшыня Гатовінскага сельсавету, Гарошка кажа:—„Я наогул не знаёмы з гэтай справай і таму ня буду расказваць сярод сялянства аб яе карысьці.

Яшчэ большую бязьдзейнасьць у справе сілосаваньня праяўляюць комсамольскія ячэйкі. Так, напрыклад, Заслаўская ячэйка ўзяла на сябе абавязак выкапаць 5 сілосных ям і ніводнае яшчэ ня выкапала. Такі-ж самы малюнак мы маем і ў астатніх ячэйках раёну. **РК КСМ дрэнна кіруе гэтай справай.**

Заданьне выкапаць 300 сілосных ям скарочана да 70 ям. Але да выкапаньня нават гэтай лічбы яшчэ ніхто не прыступіў. Ёсьць пагроза, што гэтае заданьне ня будзе выканана.

Верас.

Бюрократы з Рэчыцы не пачулі сыгналаў „Ч. З."

Па р-не не пабудавана ніводнае сілоснае ямы

Ня гледзячы на тое, што „Чырвоная Зьмена" пядаўна сыгналізавала аб агідных адносінах работнікаў і комсамольскай організацыі Рэчыцкага раёну да справы сілосаваньня, усё-ж і ў сучасны момант **ніякага зруху ў справе сілосаваньня няма.** Па раёне **пабудавана ніводнае сілоснае ямы.**

Толькі пяпер, калі пачалася ўборачная кампанія, ад АК сталі паступаць паведамленьні аб організацыі курсаў па сілосаваньню. І вось,—на курсы з 43 чалавек, вылучаных раней, зьявіліся толькі 3 чалавекі. Малжывёлсаюз і комсамольскія ячэйкі, як і раней, нічога ў гэтай справе ня робяць.

Мы пытаем у Рэчыцкіх бюрократаў і абломавых, колькі ім патрэбна сыгналаў друку для таго, каб выканаць важнейшую задачу ў справе развіцьця кармовай проблемы—сілосаваньня. Мы думаем, што на гэты раз гэтай справай зоймецца Гомельская РСІ.

Брыгадзір „Ч. З." Рэчыц...



З такіх матар'ялаў у некаторых мясцох будуюцца сілосныя бакшты

Дрысенскія лежабокі ня чуюць сыгналаў друку

Аб шэрагу буйнейшых прарываў у справе сілосаваньня па Дрысенскім раёне (Полаччына) сыгналізавалі як акруговая газэта „Чырвоная Полаччына", так і „Чырвоная Зьмена" і іншыя газэты, але да сёньняшняга дня **гора-кіраўнікі Дрысенскага раёну па-бальшавіцку ня выправілі прарываў.**

„Лепш позна—чым ніколі"

Прытрымліваючыся гэтай прыказкі работнікі Райколгассаюзу, Райвыканкому, райкому комсамолу і партыі ўвесь час спалі.

Калі пытаньне сілосаваньня стала ва ўпор перад усімі ўстановамі і грамадзкімі організацыямі, толькі тады Райколгассаюз рашыў правесьці курсы па сілосаваньню. Курсы былі разьлічаны на 40 чалавек, але, з-за адсутнасьці растлумачальнай працы сярод колгасьнікаў, на курсы зьявілася толькі 9 асоб. Такім чынам курсы былі амаль што сарваны.

Замест 100—7 няскончаных

Дрысенская комсамольская організацыя, згодна дырэктывы Акругкому ЛКСМБ, павінна пабудаваць у раёне ня менш 100 сілосных ям. Гэтае заданьне вельмі рэальнае, бо ў раёне налічваецца 22 ячэйкі.

Але на 27-ае ліпеня комсамольская організацыя толькі пачала будаваць 7 сілосных ям, якія яшчэ не закончаны. Некаторыя ячэйкі, паміж іх і колгасныя (Каркалецкая і Жоўнінская), ня толькі нічога практычнага не зрабілі ў справе сілосаваньня, але не заслухалі гэтага пытаньня ні на бюро, ні на сходзе ячэйкі.

К—нач.

Консультацыя па сілосу

Як рабіць яму для сілоса

Яму для сілоса трэба капаць як найбліжэй да хлява. Для ямы трэба выбіраць такое месца, каб ні з якога боку не працякала сюды ні вада, ні жыжка ад гною.

Яна павінна быць круглая. Глыбіня ямы—3 мэтры, а шырыня 2 мэтры.

Сьценкі ямы трэба капаць па адвесу гладка, бяз пукатасьцей. Правільнасьць сьценак трэба правяраць рэйкай, кантам цясныы, выраўненай падшнур.

Дно і верх ямы павінны быць аднолькавым. Ня дрэнна, калі дно выйдзе трохі вузей, чымся верх ямы. Але ні ў якім разе нельга рабіць дно шырэй верху. У гэтым выпадку пры асадцы сілосу ў яму пройдзе паветра.

Калі дно вышла шырэй, дык трэба пашырыць і верх. Пры гэтым трэба раўней адчышчаць сьцены па рэйцы і па адвесу.

Калі знойдуцца норы кратоў, мышэй ці якіх-небудзь іншых зьвяркоў, дык гэтыя норы трэба пагдыбей расчысьціць і моцна забіць глінай

Выкінутую зямлю трэба адкідаць паўколам ня бліжэй як на 1 мэтр ад краю ямы—гэта для таго, каб ад цяжару зямлі не абваліліся краі ямы. На чыстае ад зямлі месца трэба палажыць дзеравяны шчыт для сечкі сілосу.

Калі грунтам служыць шчытная гліна, дык сьценкі ямы будуць добра трымацца. Калі-ж грунт пясчаны, сыпкі, дык сьценкі ямы трэба абстаўляць дошкамі стойма. Для гэтага падыходзяць акрайкі кражаў з жук вінамі ці нават гарбылі.

Жукавіны лепш праверыць цаблем. Трэба, каб дошкі шчытней датыкаліся адна да другое. Адну дошку трэба ставіць да зямлі шырокім пярэднім бокам, а другую, суседнюю з ёю вузкім бокам. Трэба зрабіць так, як робяцца бочкі. На малюнку паказана, як шчыльна тады прыходзяцца жукавіны дошак адна да аднэй. Краі дошак прышываюцца цьвікамі так, каб умацаваць дошкі паміж сабою.



Абстаўка ямы дошкамі



Размеркаваньне дошак у разрэзе

Для большай грунтоўнасьці ніз і верх можна ўмацаваць поясам з брускоў. На сярэдзіне ніякіх брускоў ставіць нельга: яны будуць перашкаджаць асадцы сілосу.

Дно трэба зрабіць таксама з дошак а пад яго падкласьці ўтрамбаваную тлустую гліну.

Як зрабіць цэмэнтаваную яму

Яшчэ лепш абніцаваць сьцены ямы цэглай на цэманце. Пад цаглянкую абніцоўку патрэбен фундамант. На яму пойдзе 5 вазоў пяску, 2 вазы жарствы, ці шчэбня, 500 штук цэглы і каля 4 бочак цэманту.

Робіцца гэта так. Капаецца яма ў 3 мэтры глыбінёю і ў 2 з паловай мэтры шырынёю. Калі грунт гліністы, дык на ніз трэба насыпаць слой пяску ў 10 сантымэтраў. Гэты пясок зьлёгку змачыць і моцна ўтрамбаваць. Калі-ж грунт пясчаны, дык гэтага слою рабіць ня трэба.

Для другога слою зрабіць мяшанку з аднэй часткі цэманту і 10 частак пяску. Гэтую мяшанку зьлёгку намачыць і шчыльна ўтрамбаваць слоем у 20 сант.

Трэці слой будзе бэтон. На яго пойдзе: 1 частка цэманту, 4 часткі пяску і 5 частак дробнага шчэбню ці гравію.

Трэба толькі шчэбень ці гравій спачатку добра прамыць вадой і яшчэ сырым дамешваць да мяшанкі цэманту з пяском. Пасьля гэтага ўсю гэтую мяшанку зьлёгку змачыць вадой і моцна ўтрамбаваць на дно ямы слоем у 20 сант.

Па сканчэньню гэтай работы трэба зрабіць на дзень перарыў. Трэба даць цэманту замацавацца. Тады фундамэнт будзе гатоў.

Пасьля гэтага прыступаюць да выкладкі сьцен.


Перш за ўсё трэба насыпаць на бэтон пяску, вышынёю сантыматры ў два і накласьці абрэзкі цёсу, каб нагамі не псаваць яшчэ сьвежага бэтону.

Цэглу для сьцен трэба як можна мацней прамачыць вадой.


Кладка сьцен цэглай вядзецца на кант, як кажуць муляры, у чвертку цэглы.

Для гэтай кладкі патрэбен састаў з 1 часткі цэманту і 4 частак пяску.

Кладка вядзецца пусташоўкай, г.зн. з унутранога боку ямы швы паміж цэглай не запаўняюцца. Паміж цэглай застаюцца шчыліны для тынкаваньня,



Цэмэнтная яма зьверху



Цэмэнтная яма у разрэзе

—калі тынк войдзе ў шчыліны і будзе лепш трымаецца.

Атынкоўка робіцца па сканчэньню выкладкі цаглянай сьцяны. Для яе патрэбна мешаніна з 1 часткі цэманту і 3 частак пяску. Перш за ўсё тынкуюць сьцены. Потым абчышчаюць дно і тынкуюць яго, перасоўваючы ногі па дошчачцы. З ямы майстар вылязае па вяроўцы, перакінутай на паверх ямы праз перакладзіну.

Калі застанецца цэмант, дык яго зьмешваюць напалову з пяском і гэтым выглажваюць тынк.

Цаглянная кладка выходзіць над зямлёю прыблізна на поўмэтры. Яе абліваюць зямлёю, якая вынута з ямы. Але перш за ўсё трэба вакол цаглянай кладкі паліць зямлю вадою з ... На гэтую працу лепш усяго ... муляра ці добрага пячніка.

Такія цэмантаваныя ямы могуць быць прыгодны толькі для вялікіх колектываў і невялікіх саўгасаў. Можна пабудаваць некалькі такіх ям у адзін рад. Над усімі-ж ямамі трэба біць адну агульную павець.

А як зрабіць, калі зрунт сыпкі, няма ні дошак, ні гарбылёў, няма і грошай, каб купіць цэманту і цэглу? У гэтым выпадку можна выкарыстаць гальлё ці нават хмыз. У дно ямы ўбіваюць калы сантымэтраў на 30 кол ад колу. Лепш, калы будуць даходзіць да верху. Па кольлях пераплятаюць лазовыя пруты. Тут-жа зарыхтоўваюць гліну. Гліна павінна быць вільготнай і добра прамятай, як у пячнікоў.

Аплятаць кольлі прутамі пачынаюць зьнізу. Як толькі пляцень палымецца на поўмэтра, трэба яго набіць глінай. Для гэтага пляцень змачваюць вадой. Тады гліна лепш прыстае да пляцня.

Такім чынам трэба ўвесь пляцень аглініць. Атрымаецца як-бы гліняная шклянка на гальлі. Лепш, калі гэты пляцень да сыпкага грунту даць слой гліны. Унутры ямы магчыма раўней вырабіць тынк. Калі будуць зьяўляцца шчыліны іх зразумела патрэбна зарабіць. У такім выпадку атрымаецца зусім ... для сілосу яма.

Але яшчэ лепш беднаце і серадняцтву з'організавацца ў больш ... аб'яднаньне і ўстанавіць вялікую сілосную бакшту.

Маладзёжным цэхам—у бой за прамфінплян

Маладзёжны цэх Гомельскай швэйнай фабрыкі „Комінтэрн“ па ўсіх паказчыках ідзе ўперадзе. Толькі якасьць продукцыі яшчэ ня ўзьнята на належную вышыню. Гэты праоел неабходна ліквідаваць. Больш увагі вытворчым комунам—перадавікам комуністычнай працы

Комінтэрнаўцы! Ліквідуйце ганебнае адставаньне ў якасьці продукцыі!

Дзьве даведкі

Гомельская швэйная ф-ка „Комінтэрн“ налічвае 939 рабочых.

Яна адчынена два гады назад і вырабляе: піджакі, штаны ангельскія, штаны галіфэ, шапкі, бялізну мужчынскую і жаночую.

З старонак гісторыі ўдарнага комсамольскага

Хваля соцыялістычнага спаборніцтва ахапіла рабочых ф-кі „Комінтэрн“. Комсамольская моладзь аказалася ў першых шэрагах за ўдарныя тэмпы работы, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Абгаварылі, рашылі і прыступілі да справы. Быў створан комсамольска-маладзёжны цэх. Адміністрацыя актыўна садзейнічала стварэньню такога цэху. **Фабком актыўна маўчаў.**

7-8 месяцаў таму назад прыступілі да комплектаваньня цэху. Некаторыя таварышы крыху баяліся ісьці ў цэх, каб не асароміць званьне ўдарнага. Але комсамольска-маладзёжная напорыстасьць вырашыла пытаньне.

Адміністрацыя фабрыкі яшчэ дагэтуль няўважліва адносіцца да комсамольска-маладзёжнага цэху, спасылаючыся на тое, што гэтым цэхам займаецца комсамольскі колектыў, што для адміністрацыі ёсьць больш важныя цэхі, што комсамольскі цэх і сам справіцца з сваёю задачаю.

Адміністрацыя не дапамагае яму пазбавіцца ад загрузкі, забірае лепшых рабочых, а потым упікае гэтай загрузкай.

Заработная плата выплачвалася цэху на 3-4 дні пазьней чым іншым цэхам, што давала магчымасьць больш адсталым таварышам весьці шкодныя гутаркі па адрасу цэху.

У сучасны момант цэх вырабляе штаны-галіфэ. **У ім працуе 69** маладых рабочых, з якіх комсамольцаў—50 чалавек. Майстры цэху—комсамольцы-комуністыя.

Лічбы гавораць

За першае паўгоадзьдзе 29-30 г. прамфінплян выканан цэхам на **105,7 проц.**, а па ўсёй ф-цы на 99,1 проц. За красавік — на 124,7 проц., а па фабрыцы на 110,7 проц.; за травень — 114,9, а па фабрыцы—112,28 **проц.**; за чэрвень на 120, а па фабрыцы 108,7 проц. За 9 месяцаў гаспадарчага 1929-30 г. цэх выканаў прамфінплян на 117,5 **проц.**, а ўся фабрыка на 102,9 **проц.**

Такім чынам мы бачым, што лічбовыя паказчыкі выкананьня пляну па фабрыцы ў комсамольска-маладзёжным цэху стаяць на 1-ым месцы ва ўсе месяцы, акрамя траўня, калі цэх бялізнавы перагнаў маладзёжны і выканаў прамфінплян на 126,2 **проц.**

Тое самое і па зьніжэньню сабекошту. Згодна пляну на 1929-30 г. цэх павінен быў зьнізіць сабекошт на 2,99 **проц.**, і ён за 8 месяцаў зьнізіў на 3,42 **проц. і перавыканаў плян па зьніжэньню сабекошту на 0,43 проц.**

Шарсьцявы цэх па зьніжэньню сабекошту адстаў ад цэху ангельскіх штаноў, які перавыканаў сваё заданьне на 1,43 **проц.**

Комсамольскі маладзёжны цэх у пытаньні зьніжэньня сабекошту не дасягнуў першага месца па фабрыцы. Яму прыдзецца падцягнуцца, мобілізаваць усе сілы і энэргію на самую адданую работу, каб быць прыкладам для астатніх цэхаў фабрыкі.

Вытворчасьць працы маладзёжнага цэху стаіць на першым месцы. Так, напрыклад, аднаму чалавеку за 8 гадзін работы, згодна пляну, трэба вырабіць 5,41 адзінак, а яны вырабілі 5,95 г.зн. выканалі плян на 109,98 **проц.**, тады як цэх ангельскіх штаноў выканаў плян на 102,89 **проц.**, а піджачны—на 98,33 **проц.**

Адначасова з перавыкананьнем пляну па зьніжэньню сабекошту, вытворчасьці працы і агульным паказчыкам прамфінпляну ідзе і перавыкананьне пляну па заработнай плаце. І тут комсамольска-маладзёжны не на апошнім месцы. Ён на другім месцы пасьля шапачнага. Ён выканаў плян на 103,21 проц., а шапачны—на 105,24 проц.

Да вышэйшай формы працы

Бясспрэчным фактам зьяўляецца тое, што паказаныя дасягненьні маглі быць толькі ў выніку **масавага ўздыму рабочых** на выкананьне прамфінпляну. Толькі соцспаборніцтва, ударныя брыгады, цэхі маглі даць такія паказчыкі.

На фабрыцы ёсьць пераходны сьцяг, які ўручаецца таму цэху, які мае ў наяўнасьці ўсе якасныя паказчыкі выкананьня прамфінпляну. Пасьля 6-месячнага тэрміну трыманьня сьцягу ў адным цэху яму даецца прэмія ў разьмеры 600 рублёў.

Акрамя таго, што ўвесь цэх зьяўляецца ўдарным, у ім організаваны дзьве вытворчыя комуны. У комуны аб'ядноўваюцца найлепшыя ўдарнікі. Гэты выгляд організацыі зьяўляецца вышэйшай ступеньню соцыялістычнай працы. Комуны зьявіліся ў выніку нябывалага росту сьвядомасьці рабочай моладзі да працы ў соцыялістычным прадпрыемстве, у выніку сьвядомых, комуністычных адносін да гэтага прадпрыемства.

Комуны надта шпарка організоўваліся на фабрыцы, але ня было належнага кіраўніцтва з боку профсаюзных, комсамольскіх і парт. організацый, якія мала займаліся пытаньнем вытворчасьці, барацьбы з адсталымі настроямі, павышэньнем вытворчай кваліфікацыі, культурна-бытавой работай, а зводзілі сваю работу амаль выключна да разьмеркаваньня заработнай платы.

У некаторых комунах былі аб'яднаны некалькі процэсаў і разрадаў, што ўтварала вялікую разьбежку ў заработнай плаце.

Наглядаліся выпадкі нездавальненьня і нараканьняў адзін на аднаго, выпадкі склок, невыстарчальна разгорнута ў некаторых комунах крытыка і самакрытыка, што не давала магчымасьці сваечасова ўскрыць паасобныя недахопы і выправіць іх на хаду.

Фабрычная організацыя і адміністрацыя павінны больш уважліва адносіцца да работы вытворчых комун. Зьбіраць пэрыодычна бюро комун і абгаварваць з імі практычныя пытаньні работы.

Комсамольская ячэйка маладзёжнага цэху хоць і рэагавала на паасобныя дрэнныя ўчынкі комунараў-комсамольцаў, але несваечасова і марудна. Яна ня ўдарыла з усёй рашучасьцю па разьгільдзяях, лодырах, зрыўшчыках работы комуны.

Падцягнуць адсталы вучастак

Самае слабае месца ў комсамольскім маладзёжным цэху, гэта—дрэнная якасьць выпускаемай продукцыі. Аб гэтым гаворыць уся фабрыка, адміністрацыя, інструктары цэху, профорганізацыя і спажыўцы.

На вучастку якасьці цэх трасе хохла, ад яе трэба ў бліжэйшыя часы пазбавіцца. Комсамольскае бюро колектыву **павінна аказаць практычную дапамогу бюро цэхавай ячэйкі, узмацніць барацьбу за якасьць, за адзін з галоўных паказчыкаў у выкананьні прамфінпляну. Цэх павінен дабіцца таго, каб яго ні адзін працоўны спажывец ня ўпікнуў у дрэннай якасьці.**

У чым-жа прычына, што цэх дае продукцыю дрэннай якасьці?

Яна заключаецца ў тым, што частка рабочых нядаўна прышла з вёскі, мястэчка, саматужнай майстэрні і ставіць перад сабой задачу „загнаць паболей грошай“, а рэшта як пападзецца. Гэтыя настроі прыкметны і сярод больш адсталай часткі комсамольцаў і моладзі, асабліва зараз, пры некаторых гаспадарчых цяжкасьцях.

З падобнымі настроямі комсамольская ячэйка і колектыў па лініі выхаваўчай работы вядуць слабую барацьбу, бо з новым прытокам на фабрыку ніякая работа не вядзецца. А з мая месяца выбыло 200 чалавек. Ніякай працы не праводзіцца з комсамольцамі навічкамі.



—Што? Ударныя? „Падлізы“? Я і бяз іх „удараю!“

На гуртки па распрацоўцы XVI зьезду УсеКП(б) зьяўляюцца ня ўсе комсамольцы, беспартыйная моладзь прыцягваецца слаба.

Ганебнае павялічэньне

У цэху за паўгодзьдзе было 191 чалавек-гадзін прастояў. Трэба адзначыць, што за апошні час ідзе іх павялічэньне. Калі ў красавіку было 24 чалавека-гадзіны прастою, дык у маі—38, а ў чэрвені—43.

Большасьць прастояў прыпадае на тэхнічныя, таму што наглядаюцца нядбайныя, шкодніцкія адносіны да машын. Прымежная хуткасьць зваротаў у адну хвіліну—2100, а машыны чамусьці даганяюць да 2600-2700 зваротаў у хвіліну **ад чаго хутка ламаюцца каштоўныя, імпортныя часткі, якіх у нас не хапае.** Машыны да часу прыходзяць у нягоднасьць. **Трэба абвясьціць рашучую барацьбу з барбарскімі адносінамі да машын.**

Вось яны—ворагі, лжэўдарнікі

Комсамольскі маладзёжны цэх мае таксама ілжэўдарнікаў. Вось яны: **Левін Мэер**—сімулянт; **Левін Сёма**—вышаў з камуны, адарваўся ад грамадзкай работы, мотывуючы выхад сямейнымі абставінамі, не падпісаўся на пазыку індустрыялізацыі; **Хізьвэр**—вынесена суровая вымова, за непадпарадкаваньне інструктару і адміністрацыі; **Айнбун**—выключан з комсамолу, ён, жадаючы кінуць фабрыку, знарок псаваў тавар; **Шухман** (старшы)—увесь час псаваў тавар, пачаў папраўляцца пасьля выкліку на бюро.

Вось яны,—хто разбурае фабрыку, хто супроць ударных тэмпаў, хто супроць дачы працоўным добраякаснага тавару. На іх мове сапраўдны ўдарнік, сапраўдны змагар за соцыялістычнае прадпрыемства і працу завецца—„падлізьнік“.

Ці гэта так? Нам думаецца, што не! Хто мае права таварышоў, якія адданы працы, якія хварэюць за вытворчасьць, называць падлізьнікамі? Зразумела.—толькі ілжэўдарнік, шкоднік, разгільдзяй, гультай, прагульшчык.

Комсамольская ячэйка і адміністрацыя павінны ўдарыць па такой катэгорыі людзей і па падобных развважаньнях.

Злачынныя адносіны да брони

На фабрыцы, з цэху ў цэх, з падваконьніка на падваконьнік бясконца вандруе вучнёўская брыгада ў 24 чалав.

„Бедная бронь“,—так іх завуць рабочыя. Хутка ўжо два гады, як яны займаюцца. А што ім далі, як іх навучаюць, як іх рыхтуюць заняць кваліфікававую работу? Кваліфікаванай сілы не хапае, а адміністрацыя фабрыкі, фабком і партколектыў надзвычайна **„па-ударнаму“** рыхтуюць кадры, выкарыстоўваюць усе магчымасьці (?!), каб забясьпечыць сябе кваліфікаванай рабочай сілай.

Адносіны да брыгады вучняў безадказна - злачынныя. Нельга цярпець такога злачынства, калі ім прыходзіцца праводзіць дні без нагрузкі, без заняткаў, а адміністрацыя мотывуе гэта цеснатой памяшканьня.

Ці-ж магчыма цяпер, пры недахопе кваліфікаванай рабочай сілы, траціць марна час і грошы?

Гэта ні больш, ні менш як недаацэнка пытаньня падрыхтоўкі новых кадраў, падрыхтоўкі кваліфікаванай сілы. Гэта—зрыў дырэктыў партыі і ўраду аб кадрах.

Брыгадзір „Ч. З.“

Мікола Адзінец.

Гомель.

Працягваем абгаварэньне ліста юнкора Будаўніка—„Ці пападае юнкораўскі допіс у мэту“

Адзіным фронтам юнкораў „лёгкіх кавалерыстых“ будзем біць па ўсіх перашкодах

На чорную дошку Прапойскі РК ЛКСМБ і бюро колектыву Менскага БПТ за нерэагаваньне на юнкораўскі допіс

Гэтак юнкораўскі допіс дасягне сваёй мэты

Я ўжо доўгі час зьяўляюся юнкорам. Шмат маіх допісаў друкавалася, і большасьць з іх дала адпаведныя вынікі.

Калі добра сачыць за «Чырвонай Зьменай», дык можна бачыць, што на зьмешчаныя допісы рэагуюць. У газэце часта бывае аддзел „Чырвоная Зьмена“ дапамагла, дзе зьмяшчаюцца вынікі і адказы на расьсьледаваныя допісы.

Праўда, бываюць допісы, на якія ніхто не зварачвае ўвагі. Мы тых, хто не зварачвае ўвагі на допісы, павінны бічаваць і крытыкаваць праз газэту. Гэтак юнкораўскі допіс дасягне сваёй мэты.

Юнкор **В. Сулімчык.**

Біць па галавацяпству

Я лічу, што юнкор Будаўнік ня праў, калі робіць вывад, што ўсе допісы юнкораў дарма гінуць, альбо, як ён кажа „Б'юц у халастую“.

Допісы юнкораў дапамагаюць выявіць той ці іншы недахоп і зьнішчыць яго.

Іншая справа, калі паасобныя галавацяпы ня хочуць выправіць памылку або недахоп. Дык ці трэба ў такім выпадку апушчаць рукі. Ні ў якім разе. Трэба біць па такіх галавацяпах.

Не рэагаваньне на допісы, нажаль бывае і ў комсамольскай організацыі. У адным з нумароў „Чырвонай Зьмены“ за чэрвень месяц паведамлялася аб зрыве падпіскі на газэту ў Менскім Белпэдтэхнікуме, з паказаньнем прозьвішчаў тых, хто праваліў, але ні РК, ні бюро колектыву ЛКСМБ БПТ ня прынялі ніякіх захадаў да прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Б. Пр.

Менск, БПТ.

Ваша справа пісаць, а наша абвяргаць

Я памятаю калі я напісаў допіс „Культура па Прапойску“, у якім я выкрываў хібы з жыцьця школы, тады б. старшыня райбюро ЮП т. **Капашова** сказала:—„Вы можаце пісаць, бо вы для гэтага юнкоры, а мы можам абвяргаць“.

Я напісаў допіс аб тым, што справа па распаўсюджваньню твораў Леніна абстаіць вельмі дрэнна. Артыкул быў надрукаваны, яго прачыталі і нічога не зрабілі. І цяпер, калі ўжо прайшло 5 месяцаў з моманту зьмяшчэньня гэтага допісу, мы па раёну ня маем ніводнай ячэйкі, якая-б зьзербавала хоць аднаго падпішчыка на творы Леніна.

А вось яшчэ факт. Пяць месяцаў прайшло з таго часу як я напісаў допіс аб бясчынствах у Каменскім сельсавеце. Рэагаваньне на яго няма.

Юнкор **М. Стэрлін.**

Прапойск.

Папраўка

Ва ўчарайшым № „Ч. З.“ на 3-й стар. пад клішэ (малюнкам) напісана: „цывілізаваны прыгнятацель капіталу“. Трэба чытаць „Цывілізаваны „прыгнятацель калёній“

Усесаюзная сустрэча гароднiны
Рэйды „Чырвоназьменаўскiх“ брыгад

ПРАРЫВЫ НЕ ЛIКВIДАВАНЫ

Быць бязудзельнымi наглядальнiкамi—ганебна

Комсамольцы, беспартыйная моладзь чыгункi i транспарту! гароднiна чакае вашага ўмяшаньня

КОМСАМОЛ МЕНЦЭРАБКОПУ ВЫКЛIКАЕ ВАС НА СОЦЫЯЛIСТЫЧНАЕ СПАБОРНIЦТВА Ў ДАВЯДЗЕНЬНI ГАРОДНIНЫ ДА РАБОЧАГА СПАЖЫЎЦА

СЛОВА ЗА ВАМI

Адкрыты лiст колектыву ЛКСМБ чыгуначнiкаў i транспартнiкаў

Дарагiя таварышы!

Надышоў час, калi ў горад Менск пачалi паступаць эшалёны з гароднiнай i садовiнай.

Задачай комсамольскiх организацый зьяўляецца барацьба за нормальную организацыю работы па забясьпечаньню, барацьба з усякiмi бюрократычнымi адносiнамi i валакiтай памiж ведамствамi i ў самiх апаратах, сваечасовая разгрузка, адгрузка i перавозка гароднiны i садовiны i давядзеньне яе да рабочага спажыўца.

Комсамольскi колектыў Мен. ЦРК прыняў выклiк «Комсамольскай Праўды“ i „Чырв. Зьмены“ i ўключыўся ў паход за гароднiну i садовiну. Мы бярэм на сябе наступныя абавязкi:

1. Зорка сачыць за сваечасовай прыёмкай прыбываемай гароднiны, як па чыгунцы, так i чырвоных абозаў з вёскi.
2. Сачыць i дапамагаць сваечасовай дастаўцы гароднiны i садовiны ў крамы i асаблiва ў крамы, якiя знаходзяцца ў рабочых раёнах.
3. Аказваць садзейнiчаньне i дапамогу праўленьню МЦРК у организацыi дастаўкi гароднiны i садовiны на дом рабочым пайшчыкам.
4. Адпрацаваць 1 суботнiк на гародна-садовым складзе ў карысьць асеньняй пасеўнай кампанii.
5. Паслаць лепшых комсамольцаў у саўгасы МЦРК для дапамогi i организацыi работы па сваечасовай уборцы i дастаўцы гароднiны ў горад.

Разам з гэтым выклiкаем комсамольскiя организацыi чыгункi i транспартнiкаў уключыцца ў паход за гароднiну i садовiну.

Мы патрабуем ад вас, колектыву чыгуначнiкаў:

1. Прыняць усе меры, каб ня было вiякiх затрымак вагонаў з гароднiнай i садовiнай на шляху iх дастаўкi.
2. Наладзiць адпаведнае хаваньне гароднiны i садовiны ад псаваньня ў дарозе.
3. Сваечасова, без затрымак, падаваць вагоны з гароднiнай i садовiнай для разгрузкi.
4. Стварыць максымальна-спрыяючыя ўмовы для разгрузкi вагонаў.

Мы патрабуем ад колектыву транспартнiкаў:

1. Забясьпечыць адпаведнай колькасьцю падвод для перавозкi гароднiны i садовiны з месца прыбыцьця на склады.
2. Наладзiць сваечасовую падачу падвод.
3. Дабiцца сталага выкананьня нарадаў МЦРК на дастаўку гароднiны i садовiны, як у крамы, так i па развозцы iх на дом.
4. Дамагацца захаваньня гароднiны i садовiны пры перавозках ад псаваньня.

Мы прапануем стварыць па ўсiх ячэйках брыгады для нагляду за выкананьнем узятых на сябе абавязкаў.

Чакаем вашага адказу аб прынятых вамi мерапрыемствах праз газэту „Чырвоная Зьмена“.

Усю гэту работу прапануем весьцi ў парадку соцыялiстычнага спаборнiцтва i ўдарнiцтва з прыцягненьнем у практычную працу шырокiя колы рабочых моладзi ўсiх атрадаў „Лёгкай Кавалерыi“ для выкрыцьця ненормальнасьцяй i хутчэйшага iх лiквiдаваньня.

З комсамольскiм прывiтаньнем БЮРО КОЛЕКТЫВУ ЛКСМБ ПРЫ МЦРК.

Вычысьцiць работнiкаў якiя iгнаруюць iнтарэсы рабочага спажыўца

„Чырвоная Зьмена“ ўжо ня раз на сваiх старонках падкрэсьлiвала, што гандлёвая сетка МЦРК зусiм нездавальняюча прасоўвае гароднiну рабочаму спажыўцу. Факты за апошнi час паказваюць, што палепшаньня ў гэтым напрамку ўсё яшчэ няма. Загадчыкi лавак МЦРК, як i раней упарта ўсiмi спосабамi iмкнуцца адмовiцца ад гандлю гароднiнай i ў прыватнасьцi бульбай. Асаблiва выдзяляюцца ў гэтым напрамку крамы №№ 144, 93, 96, 48,—гэтыя крамы рэалiзаваўшы прысланую iм бульбу больш заказаў на луллбу не пасылалi i на затрабаваньнi пайшчыкаў адказвалi, што „бульбы нима наогул“, а ў гэты час на складах МЦРК бульба псавалася ад недахопу тары i месца яе хаваньня.

З боку асобных загадчыкаў лавак гэтае нежаданьне гандляваць гароднiнай часамi пераходзiць у яўнае шкоднiцтва. Ад нядбайнасьцi хаваньня гароднiны ў лаўках, апошняя цэлымi дзесяткамi пудоў псуецца i выкiдваецца на свалку. Падводы прыбываючыя з гароднiнай са складаў МЦРК часта дзякуючы выключна капрызу загадчыка лаўкi, адпраўляюцца з грузам зноў на склад, у той час калi-б прыбыўшая гароднiна з посьпехам магла быць засгаўлена ў лаўцы на продаж.

Таксама абстаiць справа i з сталоўкамi, якiя не глядзячы на шэраг прапаноў з боку рабочай грамадзкасьцi адмаўляюцца атрымоўваць гароднiну i мотывiруя гэта тым, „што ў iх няма сьмятаны“, а бяз сьмятаны нельга гатаваць страў з гароднiны. Агуркi, якiя атрымоўваюцца сталоўкамi ня глядзячы на iх недахоп скарыстоўваюцца нерацыянальна. Замест таго, каб iх засалiць i захаваць на больш доўгi тэрмiн, агуркi прадаюцца ў сталоўках як на кiрмашы па некалькi кiлёграм аднаму чалавеку.

Праўленьне МЦРК за ўвесь час нi разу не паклапацiлася аб тым, каб склiкаць загадчыкаў крамамi, якiя гандлююць гароднiнай з тым, каб належным чынам праiнструктаваць iх i ўскласьцi на iх адказнасьць за гляньвае i сваечасовае забясьпечаньне гароднiнай рабочага спажыўца.

Н. М.

Менскi чыгуначны вузел i Саюзтранс да сустрэчы гароднiны не падрыхтавалiся

Загатоўка гароднiны сустракае яшчэ значныя перашкоды з боку чыгуначнага i гужавога транспарту.

Транспарт зьяўляецца адным з самых балючых месц у сваечасовай загатоўцы гароднiны i дастаўцы яе рабочаму спажыўцу. Агульны недахоп перавозачных сродкаў паглыбляецца яшчэ нягнуткасьцю i бюрократызмам сярод работнiкаў чыгункi.

К прыкладу:—пазаўчора прыбыў у Менск на адрас МЦРК 1 ваг н памiдор. Замест таго, каб гэтыя памiдоры, якiя хутка псуюцца, хутчэй выгрузiць i тым самым аслабанiць вагон, памiдоры праляжалi ў вагоне на працягу сутак, бо з-за нядбайнасьцi чыгуначнай адмiнiстрацыi гэты вагон сваечасова не падалi к складу МЦРК.

Прыбыўшую партыю грыбоў, па вiне галавацяпаў з чыгун i, мэханiчна згрузiлi ў чыгуначны пакгауз замест таго, каб згрузiць на склады МЦРК. I толькi выпадкова, праз дзень, аб гэтым даведаўся загадчык цэнтральнай базы МЦРК. Але было ўжо позна,—грыбы папсавалiся.

Ня гледзячы на значны недахоп чыгуначнага транспарту, вагоны часта скарыстоўваюцца нерацыянальна. Учора з Негарэлага прыбыў у Менск вагон з бульбай у якiм бульбы аказалася ўсяго толькi 120 пудоў. Бульба была нагружана насыпам мокрая, з брудам. Люкi ў вагонах былi зачынены, таму бульба ў часе перавозкi пагнiла i амаль усю яе выкiнулi на звалку.

Значная частка грузаў псуецца ў дарозе ня толькi па нядбайнасьцi адмiнiстрацыi чыгункi, але часьцяком i з-за галавацяпства агентаў-нарыхтоўшчыкаў кооперацыйных организацый.

З станцыi Растоў было пагружана 2 вагоны капусты з ачышчаным верхнiм лiстом, што нi ў якiм разе недапушчаецца пры перавозках капусты. Гэта галавацяпства работнiка—агента Белрабсэкцыi дало 30 проц. браку капусты.

Прастоi вагонаў з грузамi залежаць яшчэ i ад Саюзтранспарту, якi ня змог як-сьлед наладзiць сваю работу па перавозкам. Саюзтранспарт не дае сваечасова грузчыкаў для выгрузкi вагонаў i ў вынiку МЦРК выплачвае чыгунцы сотнi рублёў за вымушаны прастой вагонаў.

Гэтыя факты паказваюць, што транспартная организацыя прапусьцiла мiж вушэй адозву партыйных, комсамольскiх i профсаюзных организацый i рабочай грамадзкасьцi аб баявой организацыi ўсесаюзнай сустрэчы гароднiны i садовiны.

Комсамольская организацыя чыгункi яшчэ дагэтуль не пераключыла сваёй увагi i iнiцыятывы на лепшае праявдзеньне ўсесаюзнай сустрэчы гароднiны i на задавальненьне ёю рабочага спажыўца.

Комсамольскiя колектывы чыгункi i транспартнiкаў! Мы чакаем ад вас дзейнага i практычнага ўдзелу па ўсесаюзнай сустрэчы гароднiны.

БРЫГАДА „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

Цi ня рана „ударной“ звацца?

(Менск)

Больш трох гадоў iснуе фабрыка „Адраджэньне“. Яна будуецца, перабудоўваецца. Была калiсьцi цацачнай, стала лыжачна-вагавай.

Але дзiвосныя справы творацца на фабрыцы.

Бляшаны цэх—самы старэйшы на фабрыцы—калiсьцi меў вялiкiя пэрспэктывы; ён вырас за тры гады свайго iснаваньня з дзесятку маладых, некалi задорных бузацёраў з бiржы працы ў такiя-ж задорныя вытворцы i ўдарнiкi,—цяпер лiквiдуецца.

Захвалявалiся бляшнiкi.

— Значыцца мы тут лiшнiя,.. Але дзесьцi мы патрэбны. Задыхаюцца-ж iншыя пабудовы i прадпрыемствы ад недахопу квалiфiкаванай рабочай сiлы.

Апусьцiлiся рукi.

А адмiнiстрацыя лавiруе: на другую працу не перакiдае i разьлiку не дае. (бо пры разьлiку ёй патрэбна выплацiць компэнсацыю).

З бляшанага цэху вывезьлi машыны—ён ня мае працы. Брыгады гуляюць ад недахопу матар'ялаў па 4-5 гадзiн у дзень. Намiнальная зарплата рабочых рэзка панiзiлася. Рабочыя бягуць да майстраў. Майстры—у недаўменьнi.

Да дырэктара... Той ганiць ад сябе

— Я гаспадарнiк... Вас я ня бачу, бачу майстраў. Iдзеце да iх!

— А майстры-ж да вас пасылаюць! Яны-ж ня ведаюць.

— Iдзеце!..

Не камандуючую ролю ад... чальнiка, а часам крыклiва—... вую узяў на сябе дырэктар.

Няўмела, з нейкiмi хiтрыкамi даюць лiквiдаваць бляшаны цэх. Iм бурлiць, кiпiць.

З вышынi свайго велiчча не мячаюць узбуджанасьцi i ра... насьцi рабочых.

У цэху 30 чалавек маладых ... чых, з якiх 19 комсамольцаў. ... ста казённай незацiкаўленасьцi ... выхадзiць з строю працаўнiкоў ... на фронце соцыялiстычнага спаборнiцтва.

* * *

Фабрыку перахрысьцiлi. Гэты... мi ёй далi новае iмя. Замест ... джэньне»—„Ударнiк“.

Але як падрыхтавалi гэтае менаваньне? Цi заслугоўвае фабрыка такое паважнае iмя—... нiк“.

Нi ў якiм разе.

На фабрыцы фактычна няма ... най ударнай брыгады, няма соц... борнiцтва.

Па ўдарнаму не працуюць ф... ныя организацыi.

Цi ня рана яшчэ назваць яе ...най“.

Комсамолец

Памяцi Рыгора Бэйлiна



Рыгор Самуiлавiч Бэйлiн радзiўся ў 1913 годзе ў сям'i саматужнiка. У 1923 годзе паступае вучыцца ў беларускую сямiгодку i па сканчэньнi яе ў 1928 годзе Райкомам комсамолу накiроўваецца ў Сав. партшколу.

Пасьля працуе ў арцелi па вырабу люстэрак, дзе вядзе актыўную работу сярод беспартыйнай рабочай моладзi. Зьяўляецца рэдактарам насьценгазэты, працуе ў цэлым шэрагу камiсiй.

У 1927 годзе ён паступ... пiонэр организацыю i ўвесь ... зьяўляўся самым прыкладн... мым энэргiчным i актыўным ... организацыi.

У 1929 годзе атрад пера... гора ў шэрагi Ленiнскага ко... лу, дзе ён па-ранейшаму ... сваiм маладым энтузiязмам ... комсамольскай рабоце.

У 1930 годзе ён накiро... ў Ленiнградзкi ФЗВ iмя ... Маркса. Прыехаўшы ў Мен... канiкулы, ён накiроўваецца ... онэр-работу ў Дукарскi пi... дом адпачынку.

28-га лiпеня ў 2 гадзiны ... лiн Сьвiслач назаўсёды пахав... сваiх хвалях Рыгора.

Менскi АК ЛКСМБ i МенАБ... з глыбокiм жалем паведам... аб трагiчнай сьмерцi пiон... ботнiка Менскай организацыi ... гора Самуiлавiча Бэйлiна.

Адказны рэдактар—Рэдколегiя

Менск, друкарня БДВ iмя тав. Сталiна

Галоўлiтбел № 5...